Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая ліра» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»*

28 лютага 2017 года, № 3 (2171)

ПАДЗЕЯ




Фота Васіля КУЗЬМІЧОНКА

# Героі на заўтра

Традыцыйна ў канцы лютага абнаўляецца Дошка гонару БДУ. Надоечы на ёй змясцілі новыя імёны і фотаздымкі 32 супрацоўнікаў і 32 студэнтаў, якія дасягнулі значных поспехаў у адукацыйнай, навуковай, метадычнай, інавацыйнай, кіраўніцкай і спартыўнай дзейнасці ў мінулым годзе.

У цырымоніі адкрыцця абноўленай Дошкі гонару прыняў удзел рэктар БДУ акадэмік ***Сяргей Абламейка***. Ён адзначыў, што добрая традыцыя існуе ўжо цягам шасці гадоў.

– Сапраўды, гэта самыя лепшыя супрацоўнікі. Мы на рэктараце бачым, колькі добрых кандыдатур вылучаецца ў нас ва ўніверсітэце, і нам заўсёды складана выбраць найлепшых, – адзначыў Сяргей Уладзіміравіч. – Аднак колькасць месцаў на Дошцы гонару абмежавана, і мы не можам размясціць на ёй усіх, хто гэтага варты.

Кіраўнік універсітэта падзякаваў тым, чые фотаздымкі ўпрыгожылі абноўленую Дошку гонару.

Пасля слова ўзялі лаўрэаты – супрацоўнікі і студэнты. Загадчык кафедры дыпламатычнай і консульскай службы ФМА ***Андрэй Русаковіч*** адзначыў, што такая традыцыйная форма ўшанавання была неад'емным складнікам нашага жыцця. Ён пажадаў усім лаўрэатам дасягнуць новых вышынь у сваім развіцці, педагагічнай працы і навуковых даследаваннях. А студэнтка 4 курса хімічнага факультэта ***Яна Дыба*** заўважыла, што Дошка гонару ў чарговы раз падкрэслівае важнасць асабістага ўкладу кожнага з нас у росквіт нашага ўніверсітэта.

**Наталля КУДРАШОВА**

АКТУАЛЬНА

# Для ПВТ досыць камп'ютара і ведаў

Дырэктар адміністрацыі Парку высокіх тэхналогій Валерый Цапкала расказаў студэнтам БДУ пра перспектывы высокіх тэхналогій.

Тэма наўпрост закранула прысутных у зале студэнтаў спецыяльнасці «Эканамічная інфарматыка» эканамфака БДУ, якім трэба будзе працаваць на інавацыйных прадпрыемствах краіны.

– Мы жывём у досыць цікавы час, таму што на нашых вачах, без перабольшання, адбываецца інфармацыйная рэвалюцыя. Усе ўжо карыстаюцца смартфонамі, хоць першы такі гаджэт з'явіўся ўсяго толькі ў 2007 годзе, – адзначыў ***Валерый Цапкала***. – XXI стагоддзе будуць вызначаць дадзеныя, гэта значыць «сырая нафта», якую здабываюць і аналізуюць, атрымліваючы інфармацыю. Яшчэ ў 2011 годзе толькі адна хайтэк-кампанія была сярод пяцёркі найбуйнейшых кампаній свету, астатнія чатыры – звязаныя са здабычай і перапрацоўкай нафты. У 2016 годзе сярод пяцёркі не было ніводнай сыравіннай кампаніі, усе – тэхналагічныя. Менавіта інфармацыйныя тэхналогіі будуць уяўляць сабою тое, у што сапраўды варта ўкладвацца.

Парк высокіх тэхналогій (ПВТ) з'яўляецца асаблівай эканамічнай зонай з адмысловым падатковаправавым рэжымам. Яго мэта – фарміраваць спрыяльныя ўмовы для распрацоўкі ў Беларусі праграмнага забеспячэння, інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, накіраваных на павышэнне канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі. Сёння ў Парку высокіх тэхналогій, як адзначыў Валерый Цапкала, працуе звыш 27 тысяч чалавек, пры гэтым штогадовы прырост складае 3000:

– Мы сапраўды зацікаўлены ў тым, каб да нас у парк прыходзіла ўсё больш маладых і здольных людзей, якія хацелі б у жыцці самарэалізавацца. У Беларусі не так шмат іншых магчымасцяў, і я так кажу не таму, што мы нейкія ўнікальныя. Справа ў тым, што кошт уваходу на IT-рынак даволі нізкі, гэта значыць для таго, каб распрацаваць нейкі прадукт, дастаткова камп'ютара і ведаў. А вось калі вы хочаце пабудаваць, скажам, аўтамабільны завод, то аб'ём неабходных на рэалізацыю рэсурсаў у гэтай сферы, несумненна, будзе вялікім.

Папоўніць шэрагі супрацоўнікаў Парку высокіх тэхналогій хуткім часам змогуць і студэнты спецыяльнасці «Эканамічная інфарматыка» эканамфака БДУ: сёлета факультэт выпускае першых дыпламаваных спецыялістаў па інтэграваным кірунку.

– Кампаніі ўскладаюць вялікія спадзяванні на выпускнікоў дадзенай спецыяльнасці, – адзначыў загадчык кафедры эканамічнай інфарматыкі ***Дзмітрый Марушка*** і дадаў: – Мы імкнёмся да таго, каб актыўна ўзаемадзейнічаць з рэзідэнтамі Парку высокіх тэхналогій і адкрываць на іх пляцоўках навучальныя лабараторыі.

Сёння кафедра эканамічнай інфарматыкі навучае 147 студэнтаў першай і другой ступені, выкладае 16 профільных дысцыплін, а таксама надае вялікую ўвагу прыцягненню выкладчыкаў-практыкаў – каля 30 % выкладчыкаў кафедры маюць досвед працы ў IT-кампаніях, у тым ліку за мяжой.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

## У нумары:

ЗНАЙСЦІ ПРАЦУ Ў АДЗІН КЛІК
У БДУ створана электронная база рэзюмэ выпускнікоў
*Стар. 2*

82,2 %. ПАСПЯХОВАСЦЬ СТУДЭНТАЎ РАСЦЕ
У БДУ распачаўся другі семестр, а значыць, прыспеў час пагутарыць пра вынікі зімовай сесіі
*Стар. 3*

ЯКІЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ ПАТРЭБНЫЯ РЫНКУ?
Студэнты з усёй Беларусі наведалі Адкрыты рэспубліканскі кар'ерны форум, арганізаваны БДУ
*Стар. 4*

## Весткі з рэктарата

**ВУЧОНЫМ** сакратаром Савета БДУ абраны дэкан механіка-матэматычнага факультэта ***Дзмітрый Мядзведзеў***.

**НОВЫЯ** кадравыя прызначэнні зацверджаны ў БДУ.

Дэканам геаграфічнага факультэта прызначаны прафесар ***Мікалай Клебановіч***.

Дэканам факультэта сацыякультурных камунікацый прызначаны кандыдат гістарычных навук ***Іван Янушэвіч***.

**ДАМОВА** пра супрацоўніцтва падпісана паміж БДУ і Дэлфцкім тэхнічным універсітэтам (TU Delft Institute for Computational Science and Engineering (DCSE). Подпісы пад дакументам паставілі акадэмік Сяргей Абламейка і прафесар Карнеліус Фаук.

Прадугледжаны абмен студэнтамі па праграмах бакалаўрыяту, магістратуры і аспірантуры, выкананне сумесных даследчых і адукацыйных праектаў, абмен інфармацыяй, навучальна-метадычнымі матэрыяламі і навуковымі дакладамі, а таксама арганізацыя сумесных канферэнцый і семінараў.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

*Каб скарыстацца мультымедыйным кантэнтам газеты:*

*1. Загрузіце на смартфон прыкладанне **Aurasma***
*2. Падпішыцеся на канал **#bsuby***
*3. Навядзіце камеру на выяву з пазнакай*

НАВАЦЫІ

# Знайсці працу ў адзін клік

## У БДУ створана электронная база рэзюмэ выпускнікоў

**Для студэнтаў выпускных курсаў надышла адказная пара – пошук першага працоўнага месца. Сёлета ахвотнікам заняць вакантныя месцы па спецыяльнасці, а ў БДУ гэта 3000 толькі бюджэтнікаў, трэба быць асабліва актыўнымі: падвойны выпуск у ВНУ і сусветная тэндэнцыя моладзевага беспрацоўя. Аднак той, хто шукае, як вядома, знойдзе, а ўніверсітэт дапаможа: у БДУ з'явілася свая база рэзюмэ выпускнікоў.**




*Над мадэрнізацыяй і прасоўваннем базы выпускнікоў працуюць і студэнты ФРКТ. Выпускніца* ***Крысціна Ермалаева*** *піша дыплом, прысвечаны праекту, наведвае з яго прэзентацыяй факультэты і працуе непасрэдна з рэзюмэ. Дыпломныя праекты на аснове базы пішуць яшчэ два пяцікурснікі:* ***Павел Лугін*** *прысвяціў працу смс-серверу, які функцыянуе ў сістэме, а* ***Артур Чамброўскі*** *аўтаматызаванню інтэрфейсу, спалучэнню базы з асабістым кабінетам студэнта. Трэцякурснік* ***Павел Аленічаў*** *адказвае за напаўненне сайта, а магістрантка* ***Аляксандра Вялічка*** *працуе над яго дызайнам. Каманда студэнтаў з «Базай рэзюмэ выпускнікоў» брала ўдзел у рэспубліканскім конкурсе праектаў «Інфармацыйныя і мабільныя тэхналогіі для адукацыйнага працэсу», дзе трапілі ў лік пераможцаў.*

Ідэя стварыць пляцоўку, дзе будуць прадстаўлены выпускнікі БДУ, а працадаўца зможа падбіраць супрацоўнікаў на вакантныя пасады, узнікла на факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ:

– Мы вельмі ясна ўяўлялі мэты і задачы гэтага праекта ў рамках нашага факультэта, таму што ведаем сферу, куды нашы студэнты імкнуцца размеркавацца, дзе яны запатрабаваны, – распавядае дацэнт кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій ***Мікалай Кальчэўскі***. – Мэта была скараціць дыстанцыю паміж працадаўцам і студэнтам, каб запрашэнне на сумоўе адбывалася без лішніх дзеянняў і працэдур – у адзін клік. Сёння працадаўцу досыць націснуць на кнопку, напісаць назву кампаніі, адрас, дату і час сумоўя, і студэнт адразу ж атрымае паведамленне з запрашэннем на тэлефон.

З тэхнічнага пункта гледжання ў праекце выкарыстоўваюцца перадавыя тэхналогіі: база стваралася на сістэме кіравання X4M.cms, якую бясплатна дала кампанія Abiatec. Яе тэхнічны дырэктар ***Дзмітрый Баброў*** па сумяшчальніцтве з'яўляецца старшым выкладчыкам кафедры фізічнай электронікі і нанатэхналогій, для стваральнікаў базы гэта прамы выхад на распрацоўшчыкаў, якія заўсёды могуць пракансультаваць, а таксама палепшыць сістэму па пажаданнях. Працу па тэхнічным суправаджэнні сайта выконвае старшы выкладчык кафедры ***Павел Пятроў***.

Выпуск студэнтаў-радыёфізікаў мінулага года паказаў: база сапраўды працуе. Як пацвярджэнне эфектыўнасці на факультэце прыводзяць такі прыклад: студэнту, які знайшоў працу, прыйшло запрашэнне праз сайт ад іншага працадаўцы. Ісці на сумоўе не збіраўся, бо пытанне з працаўладкаваннем для яго ўжо вырашылася. Аднак так выйшла, што кампанія знаходзілася побач з домам, і малады чалавек усё ж вырашыў зайсці туды па шляху. У выніку яму прапанавалі больш высокую заработную плату і годныя ўмовы працы – месца размеркавання выпускнік змяніў.

Праект сябе зарэкамендаваў і атрымаў падтрымку ад рэктара і ўпраўлення кадраў БДУ – увесну 2016 года лакальная база рэзюмэ стала агульнаўніверсітэцкай і прапісалася па адрасе **www.cv.bsu.by**. Сёння патрапіць у яе можа не толькі выпускнік, але і студэнт любога курса, зацікаўлены ў працы.

– Таксама мы не павінны забываць пра магістрантаў, аспірантаў, людзей, якія адпрацавалі размеркаванне і зноў апынуліся ў сітуацыі пошуку працы, – адзначае Мікалай Мікалаевіч. – Статыстыка кажа, што прыкладна траціна людзей шукае паўторна месца працы. Нават на працягу адпрацоўкі размеркавання маладыя спецыялісты цікавяцца вакансіямі. Акрамя гэтага, з досведу нашага факультэта я ведаю, што ёсць такая ўзаемазаменнасць: чалавек адпрацаваў размеркаванне, хоча пайсці ў іншую кампанію ці заняць больш высокааплатную пасаду, яго месца працы вызваляецца, а гэта значыць, што яно можа быць паспяхова занятае іншым выпускніком. Сістэма дазволіць «дзяліцца» вакансіямі, якія вызваляюцца.

Кожнае рэзюмэ ў базе выпускнікоў абавязкова суправаджаецца фатаграфіяй, а акрамя стандартных для рэзюмэ палёў (прозвішча, імя, імя па бацьку, факультэт, спецыяльнасць, валоданне замежнымі мовамі і г. д.) ёсць і спецыфічныя, напрыклад, «Тэма дыпломнай працы». Асаблівасць базы ў тым, што адабраць кандыдатаў працадаўца можа па навыках, адзначыўшы неабходныя палі.

– Калі мы далучылі да базы іншыя факультэты, вядома, узніклі пэўныя праблемныя моманты, – дзеліцца Мікалай Мікалаевіч. – Звесці пошук па ўсіх спецыяльнасцях у адну сістэму апынулася не вельмі проста. Праблемай было знайсці важныя крытэрыі, па якіх працадаўцы шукаюць сабе супрацоўніка не фізіка-матэматычнага профілю. Напрыклад, які навык з'яўляецца ключавым у выпускніка міжнародных адносін? Сёння гэта пытанне вырашаецца, часцяком кампетэнцыі мы «дастаём» наўпрост з рэзюмэ, якія дасылаюць студэнты.

База ўвесь час мадэрнізуецца. Палепшыць сістэму дапамагаюць і водгукі студэнтаў, якія атрымалі працу, і рэальныя сітуацыі. Мікалай Мікалаевіч распавядае:

– Да нас звярнулася кампанія, каб мы параілі студэнта з пэўнымі навыкамі. Мы знайшлі, студэнт адправіўся на сумоўе, дзе яму адразу было зададзена пытанне пра сярэдні бал. Ён быў недастаткова высокім для працадаўцы – у прыёме на працу адмовілі. У гэтай сітуацыі па адным сярэднім бале зрабілі ацэнку пра чалавека як пра спецыяліста, таму ў базе мы наўмысна не даём гэту інфармацыю відавочна – сярэдні бал у рэзюмэ адлюстроўваецца ў выглядзе зорачак.

Пакуль сістэма запаўняецца ўручную: на кожным факультэце ёсць адказная асоба, якая збірае рэзюмэ і адпраўляе іх па электроннай пошце распрацоўшчыкам праекта, яны ў сваю чаргу ўносяць інфармацыю ў базу.

– Гэта не вельмі эфектыўна, але плюс у тым, што інфармацыя праходзіць праз некалькі рук, ёсць магчымасць яе праверыць, прыбраць недахопы, – кажа Мікалай Мікалаевіч і падкрэслівае долю адказнасці, якая лягла на распрацоўшчыкаў праекта. – Сёння база прадстаўлена як універсітэцкі сайт, а значыць, ён павінен быць вычытаны, не павінна быць неправеранай інфармацыі, а фармулёўкі студэнтаў што да сваіх поспехаў і досведу павінны быць максімальна карэктныя.

У перспектыве ў аўтараў праекта аўтаматызаваць працаёмкі працэс напаўнення базы, захаваўшы высокі ўзровень праўдзівасці інфармацыі і персаніфікацыі дадзеных, каб выключыць трапленне рэзюмэ людзей, якія не маюць дачынення да БДУ. Сумесна з Цэнтрам інфармацыйных тэхналогій БДУ вядзецца праца па распрацоўцы сістэмы аўтаматычнага запаўнення і рэдагавання рэзюмэ самім карыстальнікам, а таксама па спалучэнні дадзеных з асабістым кабінетам студэнта.

На сёння ў базе змяшчаецца інфармацыя пра выпускнікоў 2016–2017 гадоў – 379 рэзюмэ зацікаўленых у працаўладкаванні студэнтаў. У пошуку кваліфікаваных кадраў на сайт абавязкова прыйдуць працадаўцы, каманда праекта ўжо атрымлівае просьбы ад кампаній размясціць актуальныя вакансіі.

– Інфармацыю пра сайт мы разаслалі па ўсёй нашай базе працадаўцаў, – распавядае ***Наталля Няпеўная***, начальнік упраўлення кадраў БДУ. – Працэс размеркавання ва ўніверсітэце адпрацаваны, таму цяпер мы ідзём далей і імкнёмся сумясціць інтарэсы выпускніка і працадаўцы. База выпускнікоў – гэта пляцоўка, дзе працадаўца і студэнт могуць убачыць адзін аднаго. Рэсурс дае магчымасць разглядаць пытанні, звязаныя не толькі з працаўладкаваннем выпускнікоў, але і са стажыроўкамі, практыкамі. У перспектыве я бачу базу як бізнес-праект, таму што, па сутнасці, гэта кадравае агенцтва, толькі без пасярэднікаў.

**Валерыя БАНДАРЧЫК**

### Да ўвагі

Для таго, што патрапіць у базу, неабходна мець жаданне і выслаць на электронную пошту kris.ermolaeva1802@gmail.com наступныя звесткі:

– запоўнены шаблон у файле doc (знайсці яго можна ў адказных на факультэтах);

– складзенае рэзюмэ ў pdf, якое будзе прымацавана на сайце, для таго, каб працадаўца змог з ім дэталёва азнаёміцца;

– фатаграфію.

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# 82,2 %. Паспяховасць студэнтаў расце

**У БДУ распачаўся другі семестр, а значыць, прыспеў час пагутарыць пра вынікі зімовай сесіі і пэўныя змены ў арганізацыі навучання з начальнікам Галоўнага ўпраўлення вучэбнай і навукова-метадычнай работы Людмілай ХУХЛЫНДЗІНАЙ.**



## Радуе першы курс

Па словах Людмілы Міхайлаўны, агульныя вынікі зімовай сесіі выяўляюць станоўчую тэндэнцыю, якая назіраецца з мінулага года: паспяховасць студэнтаў увогуле расце, што не можа не радаваць. Па ўніверсітэце паспяховасць па выніках зімовай сесіі склала 82,2 % – вырасла на 0,6 % у параўнанні з мінулым годам. Гэта даволі добры паказчык. У 2014/2015 нав. г. працэнт паспяховасці складаў 78,9 %, а ў 2013/2014 нав. г. (той набор, які будзе выпускацца сёлета) складаў усяго толькі 76,8 %. За чатыры сесіі 6 % паляпшэння – гэта вельмі добра.

Прычын росту паспяховасці цэлы комплекс. У свой час пры прыёме былі вызначаны парогавыя балы, якія дазваляюць набіраць падрыхтаваных абітурыентаў. Затым, неабгрунтаванай няяўкі на сесію робіцца значна менш – і ў мінулым годзе, і цяпер тых, хто «праспаў» іспыты па няважных прычынах, паменшала, на што ўплываюць у тым ліку і платныя перездачы. Гэта стымулюе і цверазіць студэнтаў, прымушае іх адчуваць адказнасць за сваю вучобу. Калі няма патрабавальнасці, то студэнты пачынаюць адразу думаць – ай, можна потым, пераздам… Тады паспяховасць цярпіць.

Сёлета радуе першы курс. Нават у параўнанні з мінулым годам першакурснікі здалі зімовую сесію на 6,2 % лепш – 79,6 % паспяховасць – трохі горш, чым увогуле па ўніверсітэце здаюць, але для першага курса гэта добра.

## Фактар замежнікаў

Назіраем розніцу ў паспяховасці па ўніверсітэце і яго юрыдычных асобах: без юрыдычных асоб – 82 %, а па юрыдычных асобах – 83,1 %. Найлепшую паспяховасць, у тым ліку ў параўнанні з мінулым годам, паказалі факультэты: філалагічны, сацыякультурных камунікацый, механіка-матэматычны, радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, геаграфічны, фізічны, біялагічны. Вырасла паспяховасць і ва ўсіх інстытутах, якія з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі: МДЭІ імя А. Д. Сахарава, ІБМТ, ДІКСТ, Інстытут тэалогіі. Справа ў тым, што ў нашы інстытуты паступае менш замежнікаў. Напрыклад, эканамічны факультэт не можа спаборнічаць у паспяховасці з юрыдычнымі асобамі, дзе выкладаюцца тыя ж спецыяльнасці эканамічнага профілю. Асноўны кантынгент замежных навучэнцаў – гэта ФМА і эканамічны факультэт, затым філфак і журфак. Замежнікам заўсёды складаней вучыцца, асабліва на першым курсе, тут і моўная абмежаванасць, і адаптацыя да краіны, да ВНУ... Гэта адбіваецца на паспяховасці. А ў тым жа ДІКСТ усяго з тузін замежнікаў. Ці, скажам, геаграфічны факультэт у гэтым годзе даў паляпшэнне паспяховасці ажно на 10 % – не толькі таму, што студэнты ўзяліся за розум і старанней вучыліся, але і таму, што менш замежнікаў прыехала на спецыяльнасць «геалогія». Там быў значны кантынгент з Туркменістана, а па ўнутраных прычынах гэтай краіны ўвогуле сёлета ў Беларусь туркменаў прыехала вучыцца значна менш. Па некаторых факультэтах і інстытутах былі зроблены шэраг захадаў, паспяховасць у цэлым вырасла ў параўнанні з мінулым годам, але яна ўсё яшчэ ніжэйшая, чым у сярэднім па ўніверсітэце (напрыклад, у тым жа ДІКСТ, на біяфаку). То бок, тэндэнцыя добрая, але яшчэ ёсць над чым працаваць.

## Сесія 10.0

Яшчэ адна выдатная тэндэнцыя – павялічваецца колькасць студэнтаў, якія вучацца на 9-10 балаў. Такіх 6,9 % у гэтым годзе (на 0,3 % больш, чым летась). А студэнтаў, якія маюць нездавальняючыя адзнакі, у гэтым годзе нарэшце стала трошкі менш (упершыню за апошнія тры гады) – 17 %. Прытым і тут першакурснікі малайчыны: у мінулым годзе з іх «нездавальняюча» вучыліся 19 %, а цяпер толькі 16 %.

У гэтым годзе палепшылася і паспяховасць студэнтаў-платнікаў – 73,1 % – на 3 %! А менавіта платнікі ў асноўным вызначаюць агульную паспяховасць па ўніверсітэце. Другі год практыкуем зніжкі для замежнікаў-платнікаў, гэта таксама грае сваю ролю, матэрыяльна зацікаўлены.

Ёсць у нас і ўнікальныя студэнты: на механіка-матэматычным факультэце навучэнец з Туркменістана Раўшэн Атаеў – яго сярэдні бал па выніках трох сесій 10,0. Яму, натуральна, далі максімальную зніжку. Яго калега па вывучэнні механіка-матэматычнага мадэлявання Яўген Аўдзейчык на другім курсе таксама вучыцца на 10,0! Такіх студэнтаў трэба падтрымліваць.

## Да новых стандартаў

Па меркаванні начальніка ГУВНМР, плануецца істотнае павелічэнне месцаў у магістратуры, амаль удвая, і гэта прытым, што выпускнікоў у нас не ў два разы больш.

Адправілі праект плана прыёму ў магістратуру на зацвярджэнне ў Міністэрства адукацыі. Просім, каб нам дазволілі 830 месцаў на дзённую бюджэтную форму навучання і 122 на завочную, у мінулым годзе лічбы былі каля 430 і 70 адпаведна. Магчымасць працягнуць навучанне, каб «чатырохгодкам» атрымаць больш паўнавартасную адукацыю, маецца. Паглыбленая падрыхтоўка – на другой ступені адукацыі, а першая павінна даваць шырокую базавую адукацыю. Паводле дзейных адукацыйных стандартаў прадугледжваны адзін год магістратуры для тых студэнтаў, якія навучаліся 5 гадоў, і два гады для тых, якія вучыліся 4 гады. Гэта як правіла, але маецца адрозненні па спецыяльнасцях і адукацыйных стандартах. Зараз уносяцца асобныя змены ў наяўныя стандарты, у прыватнасці, у частцы, датычнай тыпавых вучэбных планаў для двух гадоў навучання. Змены скіраваны на павелічэнне дысцыплін-кампанентаў устаноў адукацыі, то бок, пашырэнне дысцыплін спецыялізацыі.

Існыя стандарты, прынятыя ў 2012/2013 нав. г., прадугледжваюць наяўнасць дысцыплін па выбары студэнтаў, дзейнічае палажэнне, адпаведна з якім факультэты павінны забяспечваць права студэнта на выбар тых ці іншых дысцыплін, выбіраць паміж шэрагам курсаў, якія прапануюцца вучэбны план. Зараз мы прыступаем да новых адукацыйных стандартаў, пакалення 3+, там закладваецца яшчэ больш магчымасцяў для студэнта-арыентаванага навучання: будучь прапаноўвацца модулі на выбар, а таксама студэнты змогуць выбіраць асобныя дысцыпліны ўнутры модуля.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**

**ПАСПЯХОВАСЦЬ СТУДЭНТАЎ ПА ВЫНІКАХ ЗІМОВАЙ ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ СЕСІІ (ДЗЁННАЙ ФОРМЫ АДУКАЦЫІ) ПА БДУ**




АБ'ЯВЫ

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: вылічальнай матэматыкі, інфармацыйных сістэм кіравання, камп'ютарных тэхналогій і сістэм, неарганічнай хіміі,

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: біяфізікі, інтэлектуальных сістэм, інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, вылічальнай матэматыкі, метадаў аптымальнага кіравання, тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі, тэхналогій праграмавання, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, нелінейнага аналізу і аналітычнай эканомікі, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, тэарэтычнай і прыкладной механікі, функцыянальнага аналізу, біяхіміі, радыяцыйнай хіміі і хіміка-фармацэўтычных тэхналогій, фізічнай хіміі, замежнай літаратуры, кітайскай філалогіі, рускай літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, філасофіі і метадалогіі навукі, інавацыйнага менеджменту, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, міжнароднага турызму, міжнародных эканамічных адносін, тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай,

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, шматпрацэсарных сістэм і сетак, агульнай матэматыкі і інфарматыкі, мікрабіялогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, англійскага мовазнаўства, раманскага мовазнаўства, філасофіі культуры, інавацыйнага менеджменту, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, эканамічнай інфарматыкі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, міжнародных эканамічных адносін,

ВЫКЛАДЧЫКА КАФЕДРЫ англійскай мовы гуманітарных факультэтаў,

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інфарматыкі і камп'ютарных сістэм, тэлекамунікацый і інфармацыйных тэхналогій, вышэйшай матэматыкі.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220030, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД**

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: эканомікі і кіравання бізнесам (2), прававых дысцыплін, кіравання фінансамі,

СТАРШАГА ВЫКЛАДЧЫКА кафедры кіравання маёмасцю.

*Тэрмін конкурсу – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Шпалерная, 7, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 306-00-28.*

**МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БДУ**
**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС НА ЗАМЯШЧЭННЕ ПАСАД:**

ПРАФЕСАР КАФЕДРЫ біяхіміі і біяфізікі – 0,5 штатнай адзінкі;

ПРАФЕСАР КАФЕДРЫ экалагічнай медыцыны і радыебіялогіі – 0,25 штатнай адзінкі.

*Тэрмін падачы дакументаў – адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220070, г. Мінск, вул. Даўгабродская, 23 корпус 1, аддзел кадравай і арганізацыйнай працы, каб. 202, тэл. 398 88 25.*

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**Адкрыты рэспубліканскі кар'ерны форум** – pravo.by (26.01), zviazda.by, «Звязда», sputnik.by (09.02), soyuz.by (13.02), aif.by, БелаПАН, tut.by, 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё, АНТ, БелаПАН, БелТА (15.02), naviny.by, СТБ, onliner.by (16.02), zviazda.by (17.02).

**Пра Адкрытую алімпіяду па сусветнай эканоміцы сярод студэнтаў** – wuz.by, ecopress.by, zviazda.by (08.02), mogilevnews.by (09.02), mitso.by (14.02).

**Старшыня сената парламента Пакістана Міян Раза Рабані наведаў БДУ** – АНТ (02.02), БелТА (03.02).

**Тыдзень роднай мовы прайшоў у БДУ** – zviazda.by (17.02), Мінск ТБ (20.02), soyuz.by, 1 Нацыянальны канал Беларускага радыё (21.02), Tut.by (22.02).

**Двухдзённы рэспубліканскі фестываль «Студэнцкія гульні БДУ»** – minsknews.by (06.02), edu.gov.by/news (08.02), Мінск-ТБ (18.02).

**Астрафотавыстава «Беларусь у абдымках зорак» адкрылася ў Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла БДУ** – vminsk.by, «Вячэрні Мінск» (16.02), mk.by (17.02), БелТА, zviazda.by (07.02).

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

У ВОЛЬНЫ ЧАС

# Масленіцу справілі ў БДУ

**Спакон веку нашы продкі святкавалі масленіцу, праводзілі зіму і сустракалі вясну. Традыцыі працягвае і найстарэйшая ВНУ краіны, дзе 24 лютага прайшлі святочныя гулянні.**



Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Свята пачалося з тэатралізаванага прадстаўлення. Прайграўшы ў танцавальнай бітве, зіма адступіла, а прыгажуня-вясна, трымаючы ў руках сонца, прыехала на сялянскіх калёсах і атрымала свае правы.

Павіншаваў усіх з масленіцай і рэктар Сяргей Абламейка. Яму ўручылі сонца – галоўны сімвал свята. Рэктар спёк для гасцей гуляння ў некалькі бліноў. Пачастункі дасталіся самаму маленькаму наведніку свята Сцёпу і студэнтам з самымі высокімі баламі.

Сёлета ўпершыню прайшлі кулінарная бітва і творчы конкурс. Сярод усіх факультэтаў адбыўся і конкурс на найлепшае масленічнае пудзіла, створанае з улікам спецыфікі розных факультэтаў. Таксама прама на сцэне студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта спаборнічалі ў прыгатаванні бліноў. Ацэньвалі іх стравы адміністратар вядомай блінных «Дэпо» і саліст групы «Драздьі» Віталь Карпанаў. Яны засталіся задаволеныя стравамі і не змаглі вызначыць адназначнага пераможцу. Студэнты і выкладчыкі атрымалі прыемныя прызы.

Для студэнтаў і супрацоўнікаў ВНУ выступілі артысты Белдзяржцырка. Сваімі здольнасцямі здзіўлялі гімнастка і сілавы атлет. Тых, хто сабраўся, таксама забаўлялі артысты на хадулях, роставыя лялькі, юнакі і дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах. Яны танцавалі, спявалі і фатаграфаваліся з усімі ахвотнымі. Таксама перад прысутнымі выступіла група «Драздьі». Сваю творчасць дэманстравалі студэнты ў «Горадзе майстроў»: яны прадставілі ўпрыгажэнні, вырабы з дрэва, паштоўкі, а таксама малявалі ўсім узоры хной на руках. Можна было наведаць майстар-клас па чаканцы манет і самастойна іх вырабіць.

Для студэнтаў былі зладжаны традыцыйныя масленічныя конкурсы, дзе хлопцы і дзяўчаты паказвалі сваю сілу, хуткасць і спрыт. Самыя моцныя юнакі ўзбіраліся на традыцыйны слуп з падарункамі і, сарваўшы запаветны прыз, дзяліліся пачастункам з аднакурснікамі. Студэнты спаборнічалі ў перацягванні каната, бегу, дартсе, армрэслінгу і бітве падушкамі.

Стаміўшыся ад спаборніцтваў, студэнты і выкладчыкі частаваліся традыцыйнай масленічнай стравай – блінамі і саграваліся гарачай гарбатай. Завяршыліся святочныя гулянні зачаравальным фаершоу і спальваннем пудзіла масленіцы.

Студэнтка журфака *Ксенія Барысевіч* падзялілася сваімі ўражаннямі: «Мы з сяброўкай любім такія святы! Лічу, што яны вельмі патрэбныя студэнтам, бо дазваляюць завесці знаёмствы, да таго ж паважаць традыцыі важна для сучаснай моладзі».

Свята зладзіла пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.

**Дар'я КОЎЗА**

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

# Якія спецыялісты патрэбныя рынку?

**Студэнты з усёй Беларусі наведалі Адкрыты рэспубліканскі кар'ерны форум, арганізаваны БДУ. Кірмаш вакансій, прэзэнтацыі, майстар-класы, панэльная дыскусія і іншыя зоны актывацыі дапамаглі моладзі зразумець стан сучаснага рынку працы і атрымаць арыенціры ў пабудове кар'еры.**





Фота Васіля КУЗЬМІЧКІНА

Больш за тысячу студэнтаў, якія сабраліся ў канферэнц-зале атэля «Пекін», павітаў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка, а таксама HR-дырэктар Альфа-Банка Сяргей Прыходзька і дырэктар Rabota.TUT.by Святлана Шапорава. Пасля цырымоніі адкрыцця пачаліся майстар-класы.

Групы ўдзельнікаў працавалі ў «Лабараторыі дызайн-мыслення». Пра адносіны паміж рынкам працы Беларусі і студэнцкай моладдзю распавяла Святлана Шапорава. Побач праводзіла свой майстар-клас Вераніка Мандрык (ЗТАА «Джапан Табака Інтэрнэшнл Эсэндзі»), у якім распавядала пра ўсе тонкасці справавой перапіскі.

Ці патрэбны ты рынку? Такое катэгарычнае пытанне задавала назва майстар-класа ад Сяргея Прыходзькі. У той жа час з інтэрактывам выступаў кіраўнік IT House Аляксандр Мялешчанка. PR-менеджар RABOTA.TUT.BY Ганна Шагун пазнаёміла слухачоў з ключавымі памылкамі пры стварэнні рэзюмэ.

Цікавасць у студэнтаў выклікалі «хуткія гутаркі» з працадаўцамі. Speed-meeting – гэта выдатная магчымасць праверыць сваё рэзюмэ, супаставіць свае працоўныя «апетыты» рэаліям рынку працы, а таксама своеасаблівая «хвіліна славы» перад дасведчанымі і знакамітымі HR-экспертамі. Працэсам Speed-meeting кіравалі эксперты праекта Kandidat.by Сяргей Бакулін і Алена Шавялёва. Дзясяткі студэнтаў, тузін экспертаў, сотні старонак рэзюмэ і толькі паўтары гадзіны на тое, каб усе атрымалі жаданае. У такіх «экстрэмальных» умовах студэнты імкнуліся як мага ярчэй праявіць свае станоўчыя якасці.

Паралельна праходзіў майстар-клас Дзмітрыя Судакова. Прадстаўнік Маскоўскай школы кіравання «Сколкава» прывёз з сабой самую незвычайную карту – «Атлас прафесій будучыні». Жывое і дынамічнае выступленне спікера, які не пабаяўся зазірнуць у будучыню скрозь суровую рэальнасць, натхніла студэнтаў на новыя развахжанні. Але нават праз стагоддзі, калі знікнуць сотні прафесій і з'явіцца тысяча новых, любоў да сваёй справы, па меркаванні Дзмітрыя Судакова, будзе вызначальным фактар пры выбары жыццёвага шляху.

Кульмінацыйным момантам кар'ернага форуму стала панэльная дыскусія «Бізнес і адукацыя. Шляхі скарачэння адлегласці паміж акадэмічнай адукацыяй і запатрабаваннямі бізнесу». На адной сцэне сышліся прадстаўнікі палярных меркаванняў, з-за чаго гутарка знаходзілася ў пастаянным руху: ад кантрастных эмоцый да простых, але глабальных па сваёй глыбіні пытанняў.

Падвяла вынікі форуму начальнік упраўлення кадраў БДУ **Наталля НЯПЕЎНАЯ:**

– Ідэя кар'ернага форуму прыйшла да нас ад кампаній, якія ўвесь час удзельнічалі ў днях кар'еры БДУ, якія праводзяцца з 2014 года раз на семестр. Менавіта яны пажадалі сабраць на адной пляцоўцы студэнтаў розных ВНУ і спецыяльнасцяў.

Кар'ерны форум прайшоў вельмі паспяхова, а галоўнае – прадуктыўна. Кожная з пляцовак, дзе праводзіліся майстар-класы, лекцыі, трэнінгі і іншыя актыўнасці, былі перапоўнены студэнтамі. Форум не толькі даў магчымасць знайсці месца практыкі, стажыроўкі і працы, але дапамог студэнтам набыць пэўныя навыкі пошуку працы. А сёння гэта вельмі актуальна для маладых спецыялістаў.

Кампаніі-партнёры кар'ернага форуму засталіся ў захапленні ад высокай матывацыі ўдзельнікаў, а таксама адзначылі высокі арганізацыйны ўзровень мерапрыемства.

Кар'ерны форум натхніў нас не толькі на яго правядзенне ў наступным годзе, але і на тое, каб комплексна падыходзіць да працы па спрыянні працаўладкаванню і пабудове кар'еры выпускнікоў. Мы плануем стварэнне віртуальнай кар'ернай пляцоўкі, дзе выпускнікі і працадаўцы могуць узаемадзейнічаць наўпрост. Таксама хочам праводзіць цыкл пастаянных мерапрыемстваў, якія будуць накіраваны на далейшае працаўладкаванне выпускнікоў. Вельмі хочам, каб кар'ерны форум выйшаў за межы Мінска і стаў праводзіцца ў рэгіёнах. Дарэчы, праца над наступным форумам ужо пачалася.

**Кацярына РУТКОЎСКАЯ**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

28 лютага 2017 года
Падпісана да друку 27.02.2017 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

**Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
***e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by***